УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Аб’ект аўтарскага права
УДК 94(474/476ВКЛ)“15/17”(043.3)+378.4(474/476ВКЛ)(091)“15/17”(043.3)

КАЛТАЧЭНКА
Аліна Ігараўна

# АДУКАЦЫЙНЫЯ ПАДАРОЖЖЫ МАГНАТАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ВА ЎНІВЕРСІТЭТЫ ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ Ў XVI–XVIII СТСТ.

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2025

Работа выканана ў дзяржаўнай установе адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»

Навуковы кіраўнік — **Любы Андрэй Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Афіцыйныя апаненты: — **Стрэнкоўскі Сяргей Пятровіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, першы прарэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі»

**Дзярновіч Алег Іванавіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII стагоддзяў і археаграфіі дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

Апаніруючая арганізацыя — установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»

Абарона адбудзецца 21 студзеня 2026 года ў 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, ауд. 482, тэл.: 311-21-61, e-mail: surma623@gmail.com

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».

Аўтарэферат разасланы «20» снежня 2025 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — А.А. Сурма

# УВОДЗІНЫ

Даследаванне гісторыі адукацыйных працэсаў з’яўляецца важнай часткай вывучэння гісторыі культуры Беларусі XVI–XVIII стст. і дае магчымасць глыбока асэнсаваць гісторыка-культурныя працэсы, якія адбываліся ў Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ). Адукацыйныя падарожжы прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў у еўрапейскія ўніверсітэты дазволілі далучыць ВКЛ да традыцыі еўрапейскай адукацыі і еўрапейскай культуры. Дзякуючы таму, што адукацыя ў еўрапейскіх універсітэтах спрыяла знаёмству з новымі ідэямі Рэнесансу і Асветніцтва, прадстаўнікі самых уплывовых сем’яў дзяржавы прывозілі іх у ВКЛ і спрыялі распаўсюджванню гэтых ідэй, правядзенню рэформ у розных галінах жыцця грамадства ў адпаведнасці з імі. Пры гэтым, падыходы да адукацыі ў магнатаў адрозніваліся ад падыходаў іншых груп насельніцтва. Існаванне асобнай традыцыі адукацыйных падарожжаў у еўрапейскія ўніверсітэты сярод магнатаў з’яўляецца спецыфічнай часткай адукацыйных працэсаў у XVI–XVIII стст., што патрабуе пільнай увагі даследчыкаў. Іх вывучэнне з’яўляецца неабходным для ўсебаковага асвятлення гістарычнага працэсу на беларускіх землях. Таму існуе неабходнасць прааналізаваць прычыны ўзнікнення і развіцця традыцыі еўрапейскай адукацыі сярод прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў, выявіць сутнасць, змест і асаблівасці іх адукацыйных падарожжаў, уплыў падарожжаў на палітычныя, культурныя і этнаканфесійныя працэсы, якія адбываліся ў ВКЛ.

**Актуальнасць** тэмы даследавання абумоўлена тым, што да гэтага часу ўвага даследчыкаў была скіравана, у першую чаргу, на адукацыйныя працэсы, якія адбываліся ў XVI–XVIII стст. у ВКЛ. Даследчыкі надавалі ўвагу дзейнасці піяраў, праваслаўных брацтваў, пратэстанцкіх і ўніяцкіх школ, звярталі ўвагу на тое, што падарожжы па Еўропе давалі магчымасць найбольш уплывовым людзям далучыцца да агульнаеўрапейскіх працэсаў. Адзначалі, што дзякуючы гэтаму адбываўся транзіт ідэй, і эліта была правадніком агульнаеўрапейскай культуры ў ВКЛ, праводзіла рэформы ў культурнай, рэлігійнай і эканамічнай сферах, паступовa мяняла палітычны ландшафт дзяржавы. Аднак больш глыбокага аналізу гэтага працэсу не было, як не былі прааналізаваны і асаблівасці адукацыі магнатаў ВКЛ.

Для прадстаўнікоў ВКЛ у XVI–XVIII стст. сярод усіх навучальных устаноў былі цікавымі, у першую чаргу, навучальныя ўстановы Заходняй Еўропы. Пад Заходняй Еўропай у дысертацыі маецца на ўвазе гістарычны, а не геаграфічны рэгіён, дакладней – тэрыторыі асноўных феадальных заходнееўрапейскіх дзяржаў – Каралеўства Францыя, Каралеўства Англія (з 1707 г. –

Вялікабрытанія), Свяшчэнная Рымская імперыя, дзяржавы Апенінскага і Пірэнейскага паўвостраваў і іншыя, якія знаходзяцца на азначанай тэрыторыі.

**Актуальнымі** з'яўляюцца пытанні выбару сярод усіх адукацыйных падарожжаў жыхароў ВКЛ тых, якія адносяцца да падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў. Да падобнага тыпу эліты магчыма аднесці прадстаўнікоў манаршых дынастый, арыстакратыі і магнатэрыі. Прыкметамі прыналежнасці да магнатаў з'яўляюцца: валоданне вялікімі зямельнымі латыфундыямі, атрыманне высокіх дзяржаўных пасад і блізкасць да каралеўскага двара, шырокая сетка сваякоў на ўплывовых пазіцыях, бенефіцыі, утрыманне двара і сваіх узброеных сілаў, вузкі «шлюбны рынак». А. Грыцкевіч прапаноўваў уключаць у спіс магнатаў нашчадкаў удзельных князёў, прадстаўнікоў знатных феадальных родаў, якія валодалі латыфундыямі з «гарадамі, мястэчкамі і тысячамі сялянскіх дымоў», што цалкам прыбірае розніцу паміж рознымі групамі эліты[1]. Такім чынам, у дысертацыі мы будзем прытрымлівацца тэрмінаў «магнаты» і «прадстаўнікі магнацкіх сем'яў». На працягу XVI–XVIII стст. згодна з пералічанымі крытэрыямі да магнацкіх сем'яў магчыма аднесці, у першую чаргу, Радзівілаў, Сапегаў, Алелькавічаў, Хадкевічаў, Іллінічаў, Гальшанскіх, Гаштольдаў, Валовічаў, Пацаў, Агінскіх, Вішнявецкіх, Сангушкаў, Чартарыйскіх. Акрамя іх, у лік магнатэрыі трапляюць прадстаўнікі Дэнгафаў, Патоцкіх, Нарушэвічаў, Масальскіх, Глябовічаў, Палубінскіх, Храптовічаў, Касакоўскіх, Кішак, Тышкевічаў і г. д.

Яшчэ трэба звярнуць увагу на тое, якія навучальныя ўстановы цікавілі прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў ВКЛ у Еўропе. У ранні Новы час існавалі розныя магчымасці атрымаць адукацыю: школы пры манастырах і кляштарах, праваслаўных і ўніяцкіх брацтвах, гімназіі, спецыялізаваныя школы, акадэміі, універсітэты. Прававы статус універсітэта даваў, акрамя іншых акадэмічных свабод, прывілеі прысуджаць навуковыя ступені, чаго не мелі права рабіць іншыя ўстановы. Аднак для прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў галоўным быў узровень адукацыі ў навучальнай установе, а не яе прававы статус, тым больш, усе сярэднія і вышэйшыя ўстановы давалі сваім навучэнцам і слухачам падобныя агульныя і спецыяльныя веды, размежаванне сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў яшчэ ў XVII ст. было дастаткова ўмоўным, а новыя навукі (напрыклад, матэматыка) спачатку з'яўляліся ў спецыялізаваных школах і каледжах, і толькі

---

[1] Рыбчонак, С. Да праблемы паходжання магнатаў Глябовічаў – уладальнікаў Заслаўскага замка ў XVI ст. / С. Рыбчонак // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.) : зб. навук. прац / Міжнар. навук. канф., г. Мінск – Мір, 6–8 чэрв. 2013 г. / установа «Музей «Замкавы комплекс «Мір» ; пад рэд. А. М. Янушкевіча. – Мінск. : Медысонт, 2014. – С. 79–104.

потым стваraліся курсы ў тытульных універсітэтах[2]. У кантэксце працы гэтае пытанне не з’яўляецца вырашальным, таму мы не будзем акцэнтаваць увагу на дакладных і падрабязных класіфікацыях, якія прыводзяць заходнееўрапейскія даследчыкі гісторыі ўніверсітэтаў, будзем улічваць усе еўрапейскія навучальныя ўстановы, якія цікавілі прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў ВКЛ. Тым больш, гісторыя стварэння і змены прававога статусу навучальных устаноў заблытаная і складаная, яна ўлічвае шмат розных момантаў і можа з’яўляцца самастойнай тэмай для даследавання.

Храналагічныя межы працы абумоўлены тым, што ў XVI ст. адбываецца пранікненне і распаўсюджанне ў ВКЛ ідэй Рэнесансу, інтэлектуальнае жыццё эліты робіцца больш актыўным, вынікам чаго з’яўляецца цікавасць, па-першае, да замежных падарожжаў і, па-другое, рост цікавасці да еўрапейскай адукацыі. Таму ўжо ў першай палове XVI ст. пачынаюць з’яўляцца сведчанні пра здзейсненыя адукацыйныя падарожжы магнатаў, якія набылі больш сталую традыцыю ў другой палове XVI–XVII стст., і працягваліся да канца XVIII ст., калі на тэрыторыі ВКЛ адбыліся змены, звязаныя з адаптацыяй ідэй Асветніцтва.

Вывучэнне адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў ВКЛ ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы, вызначэнне іх спецыфікі, асаблівасцей і геаграфіі дае магчымасць больш глыбокага аналізу месца земляў ВКЛ у агульнаеўрапейскіх працэсах, транзіту ідэй у межах еўрапейскай цывілізацыі і ўплыву атрыманых ведаў на культурнае, рэлігійнае, палітычнае жыццё дзяржавы і рэгіёна Усходняй Еўропы.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне выканана ў адпаведнасці з планам навукова-даследчай работы (НДР) установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры» на 2021–2025 гг. у рамках тэмы НДР кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у турызме і гасціннасці «Фундаментальныя і прыкладныя даследаванні ў галіне турызму і гасціннасці: традыцыі і інавацыі» (тэма 1.1.5), зацверджанай рэктарам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры» ад 21.09.2020 (пратакол навукова-тэхнічнага савета установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры» № 4 ад 18.09.2020).

[2] Frijhoff, W. The status of higher education. The university and its competitors. / W. Frijhoff // A History of the University in Europe Vol. II : Universities in Early Modern Europe (1500–1800) / ed. Hilde de Ridder-Symoens. – Cambridge : University Press,1996, – P. 52–64.

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта даследавання – выяўленне сутнасці і зместу падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы як спецыфічнай адукацыйнай з’явы ў XVI–XVIII стст.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходным з’яўляецца вырашэнне наступных задач:

1) выявіць і прааналізаваць прычыны ўзнікнення з’явы адукацыйных падарожжаў з тэрыторыі Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.;

2) ахарактарызаваць змену канцэпцыі адукацыйных падарожжаў на гранд туры ў другой палове XVII–XVIII стст.;

3) вызначыць спецыфіку адукацыйных падарожжаў магнатаў, прааналізаваць галоўныя асаблівасці ў іх арганізацыі;

4) выявіць і акрэсліць геаграфічныя і канфесійныя асаблівасці магнацкіх адукацыйных падарожжаў ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.;

5) раскрыць асаблівасці адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў ВКЛ на падставе дыярыушаў і эпісталярных крыніц.

*Аб’ект даследавання* – адукацыя прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў ВКЛ у XVI–XVIII стст.

*Прадмет даследавання* – з’ява адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.

**Навуковая навізна даследавання**

Дысертацыйнае даследаванне арыентавана на комплекснае вывучэнне з’явы адукацыйных падарожжаў магнатаў ВКЛ ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст. Навуковая навізна дысертацыі вызначаецца сістэмным падыходам да даследчай праблематыкі. Падчас працы над тэмай дысертацыі была сабрана інфармацыя пра адукацыйныя падарожжы болей за дзвесце прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў, што дазволіла вызначыць змест адукацыйных падарожжаў, іх адрозненне ад адукацыйных падарожжаў іншых груп насельніцтва, асаблівасці ў залежнасці ад канфесійнай прыналежнасці і палітычнай арыентаванасці.

Былі прааналізаваны і сістэматызаваны дакументальныя матэрыялы, якія раскрываюць з’яву адукацыйных падарожжаў магнатаў ВКЛ ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст. У даследаванні ўпершыню выкарыстаны наратыўныя крыніцы (карэспандэнцыя і дыярыушы) з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ), Львоўскай нацыянальнай навуковай бібліятэкі Украіны імя В. Стэфаніка (Львівська національна наукова Бібліотека

України імені В. Стефаника), Бібліятэкі Ягелонскага ўніверсітэта (Biblioteka Jagiellońska), Бібліятэкі Чартарыйскіх у Кракаве (Biblioteka Książąt Czartoryskich), Навуковай бібліятэкі Польскай акадэміі ведаў і Польскай акадэміі навук у Кракаве (Biblioteka Polskiej Akademii Umiejętności i Polskiej Akademii Nauk w Krakowie). Увядзенне ў навуковы зварот новых матэрыялаў дазволіла рэканструяваць некалькі адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў з высокай доляй дакладнасці і на іх прыкладзе паказаць змест і ход адукацыйнага падарожжа, сувязь з мецэнатам падарожжа і зваротную яго рэакцыю на пэўныя падзеі падчас падарожжа.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. З прыходам у Еўропу эпохі Адраджэння пачынаецца ранняя мадэрнізацыя, часткай якой з'яўляецца рэформа грамадства. Так, у ВКЛ у XVI ст. развівалася дзяржаўная і прававая сістэмы, адбываліся эканамічныя, сацыяльныя і культурныя рэформы. Гэта прывяло да змены роляў эліты дзяржавы, якія патрабавалі новых ведаў, што і паспрыяла ўзнікненню цікавасці да еўрапейскіх адукацыйных цэнтраў сярод магнатаў ВКЛ. Да сярэдзіны XVII ст. адукацыйныя падарожжы праходзілі ў форме «peregrinatio academica», калі галоўнай мэтай падарожжа былі ўніверсітэцкія веды. У прадстаўнікоў магнатэрыі маглі існаваць і такія дадатковыя мэты падарожжа, як усталяванне карысных кантактаў, рэпрэзентацыя роду.

2. Да сярэдзіны XVII ст. у падыходзе да адукацыйнага падарожжа адбываюцца змены, фарміруецца новая канцэпцыя – гранд тур (Grand Tour), якая карэктуе погляд на карысныя для дзяржаўнай дзейнасці рэчы. Мэтамі робяцца ўдасканаленне атрыманай у ВКЛ адукацыі, вывучэнне замежных моў, азнаямленне з гаспадарчымі, культурнымі і мілітарнымі аспектамі ў еўрапейскіх дзяржавах. Новы фармат атрымаў прызнанне сярод магнатаў ВКЛ і дадаў да пазнавальна-адукацыйнага аспекту падарожжа рэпрэзентатыўна-турыстычны, з-за якога пашыраецца і змяняецца геаграфія падарожжа, яго каштоўнасць.

3. Адукацыйныя падарожжы магнатаў ВКЛ у ранні Новы час мелі свае спецыфічныя рысы, якія былі абумоўлены іх фінансавым і сацыяльным становішчам. Фінансавыя магчымасці дазвалялі здзяйсняць больш працяглыя падарожжы, адпраўляць з маладым магнатам не толькі слуг, але і іншых суправаджаючых. «Перасоўны двор» дапамагаў утварыць больш камфортныя ўмовы падчас падарожжа. Акрамя таго, такая традыцыя дазваляла здольным маладым шляхціцам, якія не мелі сваіх сродкаў, атрымаць еўрапейскую адукацыю. Мэтай адукацыйнага падарожжа быў не дыплом, а асобныя навукі, якія маглі спатрэбіцца ў будучай дзейнасці. Таму магнаты вучылі некалькі замежных моў, гісторыю, філасофію і іншыя навукі, якія пашыралі эрудыцыю,

шмат увагі надавалі фізічным практыкаванням (фехтаванне, верхавая язда). Папулярнай была вайсковая адукацыя, з якой знаёміліся не толькі ў спецыялізаваных установах Францыі, Італіі і Нідэрландаў, але і пры наведванні ваенных лагераў і месцаў бітваў.

4. Адной з галоўных асаблівасцей адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнатаў ВКЛ была шырокая геаграфія маршрутаў. Кожны маршрут планаваўся з улікам традыцый роду, бягучай сітуацыі ў акадэмічным асяроддзі Еўропы, пэўнай кар’ернай стратэгіі і персанальных схільнасцей маладога чалавека. Кожны маршрут быў індывідуальным: уключаў наведванне некалькіх навучальных устаноў і закранаў некалькі дзяржаў Заходняй Еўропы. Важную ролю ў планаванні маршрутаў іграў канфесійны фактар, а пасля разгортвання працэсу канфесіяналізацыі да яго дадаўся і палітычны аспект.

5. Характэрнай рысай і асаблівасцю адукацыйных падарожжаў магнатаў было напісанне дыярыуша і багатая карэспандэнцыя з домам падчас падарожжа. Гэта было дадатковым элементам адукацыі, які дазваляў сачыць за поспехамі маладых людзей, своечасова карэктаваць адукацыю і назапашваць вопыт для будучых пакаленняў. Такая карэспандэнцыя і дыярыушы з’яўляюцца добрымі крыніцамі для рэканструкцыі адукацыйных падарожжаў магнатаў ВКЛ у XVI–XVIII стст., што змяшчаюць шмат рознай інфармацыі, якая максімальна поўна раскрывае маршрут, змест і ход адукацыйнага падарожжа.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені ў выніку дысертацыі з аддзяленнем іх ад суаўтараў сумесных даследаванняў і публікацый**

Дысертацыя з’ўляецца ўласным даследаваннем саіскальніка, выкананым цалкам самастойна, заснаваным на вывучэнні гістарычных крыніц з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (г. Мінск), Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве, Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы (г. Варшава), Бібліятэкі Ягелонскага ўніверсітэта (г. Кракаў), Бібліятэкі Чартарыйскіх (г. Кракаў), Навуковай бібліятэкі Польскай акадэміі ведаў і Польскай акадэміі навук у Кракаве (г. Кракаў), Бібліятэкі Літоўскай Акадэміі навук (г. Вільнюс), Бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта (г. Вільнюс), Львоўскай нацыянальнай навуковай бібліятэкі Украіны імя В. Стэфаніка (г. Львоў), Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны (г. Кіеў), з улікам ужо апублікаваных крыніц, матэрыялаў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Праведзеная праца дазволіла выявіць і прааналізаваць прычыны ўзнікнення з’явы адукацыйных падарожжаў магнатаў, вызначыць іх спецыфіку, акрэсліць асаблівасці адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены на 15 рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях: 1) Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і 65-годдзю гістарычнай адукацыі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы «Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава» (12–13 снежня 2019 г., Гродна); 2) Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Лёс фамільных скарбаў магнацкіх родаў Беларусі» (10 лістапада 2020 г., Нясвіж); 3) XVII Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі маладых вучоных і аспірантаў «Социально-гуманитарные знания» (26 лістапада 2020 г., Мінск); 4) III Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Этнаканфесійныя адносіны ў Вялікім Княстве Літоўскім: царкоўныя інстытуты і грамадска-палітычныя пераўтварэнні XV–XVIII стст.» (4 снежня 2020 г., Мінск); 5) Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 400-годдзю нараджэння канцлера ВКЛ Крыштофа Жыгімонта Паца (1621–1684) «The noble family of Pacai (Pacowie) of the Grand Duchy of Lithuania and the Lithuanian baroque» (13–14 мая 2021 г., Каўнас); 6) II Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Autorki i bohaterki tekstów kultury» (18 кастрычніка 2021 г., Варшава); 7) VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Україна і Велике князівство Литовське в XIV–XVIII стст.: політичні, економічні, міжнаціональні та соціокультурні відносини в загальноєвропейському вимірі» (20–23 кастрычніка 2021 г., Камянец-Падольскі); 8) Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Пічэтаўскія чытанні – 2021: 100 гадоў БДУ – першаму ўніверсітэту Беларусі» (27–28 кастрычніка 2021 г., Мінск); 9) Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Пічэтаўскія чытанні – 2022: універсітэты і архівы як састаўныя элементы экалогіі культуры» (30 верасня 2022 г., Мінск); 10) Другія Лойкаўскія чытанні «Вымярэнні Вялікага Княства Літоўскага: асоба і сацыяльныя групы» (17 лістапада 2022 г., Мінск); 11) XIX Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі маладых вучоных і аспірантаў «Социально-гуманитарные знания» (30 лістапада 2022 г., Мінск); 12) III Навуковых чытаннях памяці доктара гістарычных навук Юрыя Мікалаевіча Бохана «Асоба, чалавек і супольнасць у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага XIV–XVIII стст.» (12 красавіка 2023 г., Мінск); 13) XIX Міжнародных кнігазнаўчых чытаннях «Дыярыуш падарожжа і яго эвалюцыя ў XVI–XVIII стст.» (27–28 красавіка 2023 г., Мінск); 14) Справаздачнай навукова-практычнай канферэнцыі аспірантаў-выпускнікоў «Наука. Образование. Инновации» (31 мая 2023 г., Мінск); 15) Міжнароднай

навуковай канферэнцыі «History, Culture, and Heritage of Manors in Centural and Eastern Europe» (24–26 красавіка 2025 г., Каўнас).

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання ўкаранёныя ў навучальны працэс кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін турызму і гасціннасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры» (акт аб укараненні вынікаў навукова-даследчай працы ў адукацыйны працэс ад 16 лістапада 2022 г.). Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць ўкаранёны ў навучальны працэс Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» (даведка аб магчымым практычным выкарыстанні вынікаў дысертацыйнага даследавання ў навучальны працэс ад 20 кастрычніка 2023 г.).

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання былі ўключаны ў тэкст навучальнага дапаможніка па дысцыпліне «Гісторыя падарожжаў і турызму» (дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці навучальнага дапаможніка, 2022 г.).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі адлюстраваны ў 6 навуковых артыкулах у выданнях, якія ўключаны ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (3,9 аўт. л.), 8 публікацый – артыкулы ў айчынных і замежных выданнях (3,4 аўт. л.), 9 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый (3,2 аўт. л.), 1 – раздзел у навучальным дапаможніку для навучэнцаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі (1,4 аўт. л.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 11,9 аўтарскіх аркушаў.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыйнага даследавання абумоўлена мэтай і задачамі і складаецца ўводзін, агульнай характарыстыкі працы, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, дадаткаў. Агульны аб'ём працы – 395 старонак, з іх 117 старонак займае асноўны тэкст. 68 дадаткаў займаюць 231 старонку. Спіс выкарыстаных крыніц змяшчае 542 пазіцыі і 24 публікацыі аўтара (усяго 44 старонкі).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ

У першай главе «**Гістарыяграфія і крыніцы. Метадалогія і канцэпцыі даследавання**» прааналізавана ступень вывучанасці навуковай праблемы, вызначаны комплекс крыніц, ахарактарызавана метадалогія працы.

*Гістарыяграфія праблемы* прадстаўлена аналітычным аглядам навуковай літаратуры па тэме даследавання. Гістарыяграфічны агляд абапіраецца на рэгіянальна-моўны прынцып.

У беларускай гістарыяграфіі праблематыка, звязаная з гісторыяй падарожжаў прывілеяванага саслоўя, асабліва не закранаалася, існуюць толькі асобныя працы ў кантэксце гісторыі адукацыі[3]. У канцы XX – пачатку XXI ст. адукацыйнымі вандроўкамі зацікавіліся філолагі і культуролагі, і толькі потым – гісторыкі ранняга Новага часу. Беларускія даследчыкі вывучаюць пытанні геаграфіі адукацыйных падарожжаў[4], асобныя прыклады навучання магнатаў у Еўропе[5]. Інфармацыю пра здзейсненыя адукацыйныя падарожжы магчыма знайсці і ў энцыклапедыях па гісторыі Беларусі[6], і гісторыі ВКЛ[7]. Беларускія даследчыкі таксама не абыходзяць увагай публікацыю дыярыушаў і мемуараў падарожжаў[8].

Аналіз польскай гістарыяграфіі выявіў, што найбольш распрацаванай тэмай з'яўляецца геаграфія адукацыйных падарожжаў і асаблівасці навучання ў пэўных еўрапейскіх гімназіях і ўніверсітэтах. Найбольшы ўклад у гэтае

---

[3] Селицкий, С. В. Школа и педагогическая мысль в Белоруссии в период нахождения ее в составе Великого княжества Литовского и Речи Посполитой (XIV–XVIII вв.) : автореф. дис. ... канд. пед. наук : 13.00.01 / Селицкий Степан Васильевич ; НИИ общ. педагогики АПН СССР. – М., 1973. – 20 с.

[4] Самусік, А. Ф. Навукова-асветныя кантакты беларускіх зямель з краінамі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы ў XVIII ст. / А. Ф. Самусік // Развитие. – 2007. – № 1. – С. 39–44; Банькоўскі-Цюліг, М. Студэнты і студэнткі з Беларусі ў швейцарскіх універсітэтах (XVI – пач. XX стст.) / М. Банькоўскі-Цюліг // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 4. – С. 50–58.; Катлярчук, А. «Уцёкі мазгоў», ці Лёсы пратэстантаў Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVII ст./ А. Катлярчук // Спадчына. – 2006. – № 1 (155). – С. 65–78.

[5] Скеп'ян, А. А. Некалькі лістоў маладых магнатаў з адукацыйных падарожжаў у Італію і Германію ў XVI стагоддзі / А. А. Скеп'ян // Silva rerum nova. Штудыі ў гонар 70-годдзя Г. Я. Галенчанка : зб. / рэдкал. : А. Дзярновіч [і інш.]. – Вільня [і інш], 2009. – С. 258–264.

[6] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск. : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993–2003. – 6 т.

[7] Вялікае княства Літоўскае: ВКЛ : энцыкл. : у 3 т. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў, Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2007–2010. – 3 т.

[8] Галенчанка, Г. Я. Невядомыя і малавядомыя помнікі духоўнай спадчыны і культурных сувязей Беларусі XV – сярэдзіны XVII ст. / Г. Я. Галенчанка. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – 458 с.

пытанне ўнеслі Г. Барыч[9], С. Кот[10], Д. Жоладзь-Стшэльчык[11], З. Петшык[12] і інш. Шмат увагі было нададзена і аналізу адукацыйных падарожжаў пэўных магнацкіх родаў і біяграфіі асобных магнатаў. Класічнай працай з'яўляецца даследаванне М. Хахая па адукацыі роду Радзівілаў[13].

У асобную групу прац вылучаюцца рэканструкцыі адукацыйных падарожжаў. Тут трэба звярнуць увагу на працы М. Братуня пра падарожжа Міхала Юрыя Вандаліна Мнішэка[14] і А. Маркевіч пра падарожжа Яна Станіслава, Аляксандра Яна і Станіслава Караля Ябланоўскіх[15].

Шмат даследаванняў прысвечана вывучэнню крыніц па тэме падарожжаў у еўрапейскія ўніверсітэты, асабліва дыярыушаў падарожжаў. Іх разглядаюць як крыніцу даследаванняў[16], аналізуюць іх эвалюцыю, робяць спробы зразумець светаўспрыманне чалавека эпохі ранняга Новага часу праз запісанае[17].

Актыўнае вывучэнне пытання адукацыі магнатаў адбываецца і сярод літоўскіх навукоўцаў. Сярод найбольш цікавых і значных прац трэба адзначыць некалькі дысертацый, у якіх даследуецца пытанне адукацыйных падарожжаў і замежнай адукацыі сярод эліты[18] і менш прывілеяваных жыхароў ВКЛ[19].

---

9 Barycz, H. Spojrzenia w przeszłość polsko-włoską / H. Barycz. – Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1965. – 446 s.

10 Kot, S. Polska złotego wieku a Europa : studia i szkice / S. Kot. – Warszawa : PIW, 1987. – 913 s.

11 Żołądź-Strzelczyk, D. Peregrinatio academica. Studia młodzieży polskiej z Korony i Litwy na akademiach i uniwersytetach niemieckich w XVI i pierwszej połowie XVII wieku / D. Żołądź-Strzelczyk. – Poznań : wyd-wo naukowe Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza, 1996. – 241 s.

12 Pietrzyk, Z. W kręgu Strasburga: z peregrynacji młodzieży z Rzeczypospolitej polsko-litewskiej w latach 1538–1621 / Z. Pietrzyk. – Kraków : Księgarnia Akademicka, 1997. – 302 s.

13 Chachaj, M. Zagraniczna edukacja Radziwiłłów: od początku XVI do połowy XVII wieku / M. Chachaj. – Lublin : wyd–wo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 1995. – 171 s.

14 Bratuń, M. «Ten wykwintny, wykształcony Europejczyk»: zagraniczne studia i podróże edukacyjne Michała Jerzego Wandalina Mniszcha w latach 1762–1768 / M. Bratuń. – Opole : UO, 2002. – 316 s.

15 Markiewicz, A. Podróże edukacyjne w czasach Jana III Sobieskiego: Peregrinationes Jablonovianae / A. Markiewicz. – Warszawa : DiG, 2011. – 370 s.

16 Hartleb, K. Polskie dzienniki podróży w XVI. w. jako źródła do współczesnej kultury: uwagi i przyczynki / K. Hartleb. – Warszawa : skł. gł. «Książnica» Towarzystwa Nauczycieli Szkół Wyższych, 1920. – 87 s.

17 Dziechcińska, H. Świat i człowiek w pamiętnikach trzech stuleci: XVI–XVII–XVIII / H. Dziechcińska. – Warszawa : IBL PAN, 2003. – 163 s.

18 Šedvydis, L. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės valdančiojo elito rengimas viešajam valstybės gyvenimui XVI a. – XVII a. viduryje : diss. … humanitariniai mokslai / Laurynas Šedvydis ; Vytautas Magnus Univ. – Kaunas, 2016. – 233 p.

19 Subotkevičienė, R. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės gyventojų edukacinės kelionės XIV a. pabaigoje–XVI a. 8-ajame dešimtmetyje : diss. … humanitariniai mokslai / Rinata Subotkevičienė ; Klaipėdos universiteto leidykla. – Klaipėda, 2015. – 275 p.

Літоўскія даследчыкі надалі ўвагу канфесійнаму складніку адукацыйных падарожжаў[20] і іх геаграфіі[21].

У краінах постсавецкай прасторы вывучэнне традыцыі замежнай адукацыі доўгі час не было актуальным, таму напрацовак яшчэ не так шмат. Так, сярод украінскіх гісторыкаў выклікаюць цікавасць працы па геаграфіі адукацыйных падарожжаў[22]. Сярод расійскіх даследчыкаў карыснымі з'яўляюцца працы А.Ю. Андрэева, прысвечаныя сувязі рускага студэнцтва з нямецкімі ўніверсітэтамі[23].

Праведзены аналіз гістарыяграфіі па тэме дысертацыі дазволіў выявіць неабходнасць у напісанні працы па гісторыі адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў ВКЛ у XVI–XVIII стст., якая б сабрала разрозненыя сведчанні і рэканструявала працэс адукацыйных падарожжаў эліты ў ранні Новы час.

*У другім раздзеле* главы прыводзіцца характарыстыка крыніц дадзенага даследавання, якія магчыма падзяліць на дзве катэгорыі: дакументальныя і нарратыўныя.

К дакументальным актавым крыніцам адносяцца *тастаменты*, якія ўтрымліваюць інфармацыю не толькі пра вырашэнне маёмасных пытанняў і матэрыяльнае забеспячэнне нашчадкаў, але і запісы наконт будучыні дзяцей, іх выхавання і адукацыі. Маршрут падарожжа дапамагаюць даследаваць *матрыкулы еўрапейскіх універсітэтаў*, якія захаваліся ў дастаткова вялікай колькасці.

Аснову дысертацыі склалі нарратыўныя крыніцы: *эпісталярныя* (справаздачы падчас падарожжа) і *мемуарныя* (дыярыушы і мемуары). Важная інфармацыя змяшчаецца і ў *інструкцыях і павучаннях*, якія пісаліся падчас падрыхтоўкі да падарожжа з мэтай давесці волю бацькоў ці апекуноў наконт формы, зместу, маршруту адукацыі, *працах вучняў, панегірыках* і г. д. Акрамя таго, па тэме дысертацыі магчыма знайсці інфармацыю ў *фінансавых дакументах*: вэксалі і чэкі, сведчанні запазычанняў і даўгоў, справаздачы па выдатках.

---

[20] Lukšaitė, I. Reformacija Lietuvos Didžiojoje Kunigaikštystėje ir Mažojoje Lietuvoje. XVI a. trečias dešimtmetis – XVII a. pirmas dešimtmetis / I. Lukšaitė. – Vilnius : Baltos lankos, 1999. – 647 p.
[21] Štikonaitė, I. Lietuvos kultūriniai ir akademiniai ryšiai su Šveicarija XVI–XX amžiuje / I. Štikonaitė // Archivum Lithuanicum. – 2004. – № 6. – P. 199–238.
[22] Блажейовський, Д. Студенти візантійсько-київського обряду в папських колегіях і семінаріях, університетах та інститутах Центральної і Західної Європи (1576–1983) / Д. Блажейовський. – Рим : О. О. Василіян, 1984. – 366 с.
[23] Андреев, А. Ю. Русские студенты в немецких университетах XVIII – первой половины XIX века / А. Ю. Андреев. – М. : Знак, 2005. – 432 с.

Выкарыстаныя ў ходзе дысертацыйнага даследавання гістарычныя крыніцы маюць разнапланавы характар і дазваляюць дасягнуць пастаўленай мэты.

*У трэцім раздзеле* прадстаўлены характарыстыкі прынцыпаў, метадаў і падыходаў, якія былі выкарыстаны ў ходзе даследавання. Дадзеная праца абапіраецца не толькі на агульнанавуковыя, але і на спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны, метад прасапаграфіі, case studies. Гэта дазволіла нам выявіць кола асоб, якія здзяйснялі адукацыйныя падарожжы і адносіліся да прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў, прасачыць эвалюцыю адукацыйных падарожжаў магнатаў ВКЛ, падрабязна разгледзець некалькі асобных падарожжаў.

*Канцэптуальная ідэя дысертацыйнага даследавання* заключаецца ў тым, што пасля надыходу эпохі Рэнесансу адбыліся кардынальныя змены дзяржаўнага кіравання, якія патрабавалі новых ведаў і новых падыходаў да адукацыі. Да ВКЛ гэтыя змены дайшлі ў той момант, калі на землях Свяшчэннай Рымскай імперыі пачалі ўзнікаць навучальныя ўстановы новага тыпу, якія прапаноўвалі новыя ўзоры навучальных праграм, прывабныя для магнатаў. Гэта і стала перадумовай узнікнення з'явы замежных адукацыйных падарожжаў.

Першапачаткова мэтамі адукацыйных падарожжаў былі: навучанне ў пэўным універсітэце ці ў асобных прафесараў, спіс неабходных для будучай кар'еры навук, прэзентацыя свайго роду, усталяванне і падтрымка кантактаў з еўрапейскімі элітамі, манаршымі дынастыямі, знакамітымі дзеячамі рэлігіі і культуры. Аднак паступова погляд на адукацыю змяняўся, працэс падарожжа пачынае разглядацца як магчымасць пашырыць кругагляд, прывіць добры густ, азнаёміцца з дасягненнямі культуры і асаблівасцямі дзяржаўнага кіравання. Так, фармулявалася новая канфэпцыя адукацыйных падарожжаў – гранд тур (Grand Tour).

Далейшае развіццё традыцыі адукацыйных падарожжаў сярод прадстаўнікоў магнацкіх сямей было звязана са зменамі ў падыходах да выхавання і адукацыі, усё большым турыстычным аспекце падарожжаў і змяншэннем акадэмічнага складніка. У XVIII ст. у Рэчы Паспалітай пачалі адкрывацца навучальныя установы, якія прапаноўвалі кароткія, насычаныя і практычныя курсы для дзяцей магнатаў і шляхты. Таму ў другой палове XVIII ст. у Еўропу з мэтай адукацыі ездзілі ўжо адзінкі.

Адукацыйныя падарожжы магнатаў ВКЛ значна адрозніваліся ад адукацыйных падарожжаў іншых саслоўных груп. У магнатаў не было патрэбы ў поўным і завершаным цыкле навучання, які пацвярджаўся дакументам, таму вучыліся яны па індывідуальных праграмах, надавалі шмат увагі мовам,

наведвалі прыватныя ўрокі, заняткі па фехтаванню і верхавой яздзе, а таксама праяўлялі цікавасць да ваенных лагераў. Адметнай асаблівасцю была і шырокая геаграфія падарожжаў. Маршрут падарожжаў праходзіў праз нямецкія землі, Францыю, Нідэрланды, Швейцарыю, Італію. У некаторых дзяржавах наведвалі ўніверсітэты, у іншых – каралеўскія двары ці ваенныя лагеры. Выбар маршрута падарожжа і навучальных устаноў залежаў як ад традыцый роду, знакамітых прафесараў, так і ад канфесійнай прыналежнасці і палітычнай арыентацыі прадстаўнікоў магнацкіх сямей.

У другой главе «**Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў кантэксце змен элітарнай адукацыйнай палітыкі эпохі барока**» выяўлены прычыны цікавасці да адукацыйных падарожжаў ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст., разгледжаны працэс з'яўлення, развіцця і згасання гэтай цікавасці.

Першы раздзел *«Рэформа сістэмы адукацыі ў Еўропе і з'яўленне традыцыі адукацыйных падарожжаў сярод магнатаў ў XVI ст.»* прысвечаны разгляду прычын з'яўлення цікавасці да замежнай адукацыі сярод эліты ў XVI ст. У ім асвятляюцца рэформы адукацыі ў эпоху Рэнесансу, асабліва моцна разгорнутыя падчас Рэфармацыі і Контррэфармацыі, паказаны новы тып навучальных устаноў – гімназіі, раскрыты працэс фармавання разумення карысці адукацыі для эліты.

Другі раздзел *«Развіццё традыцыі адукацыйных падарожжаў ва ўніверсітэты Еўропы ў XVII ст.»* змяшчае інфармацыю пра далейшае развіццё традыцыі адукацыйных падарожжаў. Адзначаецца, што ў XVII ст. склаліся ўяўленні пра ідэальную адукацыю, якая складалася з адукацыі дома, у школе, калегіуме ці гімназіі і еўрапейскім універсітэце. У XVI – першай палове XVII ст. асноўным тыпам замежнага падарожжа з мэтай адукацыі было «peregrinatio academica» – падарожжа ў еўрапейскія ўніверсітэты ў традыцыі Сярэдніх вякоў.

У сярэдзіне XVII ст. адбываюцца змены ў мадэлі замежнай адукацыі, з'яўляецца новая канцэпцыя адукацыйнага падарожжа – «гранд тур». Па ёй акадэмічнае навучанне адыходзіла на другі план, было больш кароткатэрміновым, але не знікала, часцей за ўсё было адным з этапаў ці элементаў падарожжа.

У трэцім раздзеле *«Змены ў адукацыйнай палітыцы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVIII ст.»* разглядаюцца далейшыя змены ў адукацыйных падарожжах, калі ўвага маладых людзей пераходзіла з універсітэтаў на прафесійныя школы, якія пачалі адкрывацца ў XVIII ст. На фоне гэтага гранд туры ўсё больш аддаляліся ад першапачатковых адукацыйных мэт і рабіліся падарожжамі для развіцця густу і эстэтычнасці, з невялікімі эпізодамі вывучэння

замежных моў і наведвання асобных лекцый ва ўніверсітэтах. У другой палове XVIII ст. пачынаюць з’яўляцца жаночыя падарожжы, якія пераймаюць ідэі і маршруты мужчынскіх гранд тураў. Пры гэтым мужчыны з мэтай адукацыі ў Еўропу ездзілі адзінкава і набывалі вайсковую ці мастацкую адукацыю, вывучалі мовы. Звязана гэта было не толькі са здавальняючым узроўнем адукацыі ў Рэчы Паспалітай і адаптацыяй ідэй Асветніцтва, але і са складанай палітычнай сітуацыяй на Радзіме.

Трэцяя глава «**Змест і асаблівасці адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст.**» прысвечана больш падрабязнаму аналізу зместу адукацыйных падарожжаў магнатаў ВКЛ у еўрапейскія ўніверсітэты ў XVI–XVIII стст., выяўленню іх асноўных асаблівасцей.

У раздзеле 3.1 *«Геаграфія адукацыйных падарожжаў і асноўныя цэнтры адукацыі магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVI-XVIII ст.»* разглядаюцца асноўныя маршруты адукацыйных падарожжаў і аналізуюцца найбольш папулярныя еўрапейскія акадэмічныя цэнтры сярод прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў. Адзначана, што найбольш папулярнымі былі нямецкія ўніверсітэты, сярод якіх вылучаліся Лейпцыгскі, Страсбургскі, Інгальштацкі, Альтдорфскі, Кёнігзбергскі. Другімі па папулярнасці былі італьянскія цэнтры навукі: Рым, Падуя, Балонbackup. Да сярэдзіны XVII ст. цікавым быў Базель. У XVII ст. многія вучыліся ў Лёвене і вайсковых школах Нідэрландаў. У Францыі найбольш папулярнымі адукацыйнымі цэнтрамі былі Парыж і Арлеан. Акрамя таго, магнаты ездзілі ў Іспанію і Вялікабрытанію з мэтамі азнаямлення з дзяржавай, удасканалення вайсковага рамяства, турыстычнымі, рэлігійнымі і інш.

Асобна разглядаецца пытанне ўплыву канфесіі на адукацыйныя падарожжы магнатаў у XVI–XVIII стст. Паказаны асаблівасці падыходаў да еўрапейскай адукацыі і выбару маршрута ў залежнасці ад канфесіі, адзначаны ўплыў працэсу канфесіяналізацыі на выбар універсітэта, прыведзены прыклады канверсій маладых магнатаў падчас навучання ў Еўропе.

Раздзел 3.2 *«Спецыфіка зместу і праграмы навучання ў адукацыйных падарожжах магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст.»* прысвечаны вывучэнню асаблівасцей праграмы навучання магнатаў у еўрапейскіх універсітэтах. Адзначана, што пры выбары дысцыплін і навук магнаты кіраваліся практычнасцю ведаў. Аснову адукацыі складала вывучэнне замежных моў (лацінская, нямецкая, французская, італьянская і інш.), гісторыі, філасофіі. Важнае месца займаў фізічны стан і ўменні верхавой язды, фехтаванне і г. д. Маладыя магнаты бралі індывідуальныя заняткі па «рыцарскіх навуках», наведвалі ваенныя лагеры, а пасля і вучыліся ў рыцарскіх акадэміях, дзе даваўся

неабходны мінімум гуманітарных ведаў, а асноўную ўвагу надавалі вайсковым навукам.

У раздзеле 3.3 *«Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сямей Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст.»* аналізуецца найбольш прыдатны ўзрост выправы ў адукацыйнае падарожжа, працягласць замежнай адукацыі. Вызначаны склад і функцыі світы маладога магната падчас падарожжа, шмат увагі нададзена ролі гувернёра ў гэты перыяд. Разгледжаны і адукацыйныя інструкцыі, якія з'яўляюцца добрай крыніцай для вывучэння асаблівасцей падрыхтоўкі і правядзення адукацыйных падарожжаў эліты.

Чацвёртая глава «**Рэканструкцыя адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага з дапамогай нарратыўных крыніц**» прысвечана рэканструкцыі некалькіх адукацыйных падарожжаў на аснове розных нарратыўных крыніц.

*У першым раздзеле* праведзена рэканструкцыя адукацыйных падарожжаў сыноў Льва Сапегі: Яна Станіслава ў 1606–1613 гг., Крыштофа Мікалая і Казіміра Льва ў 1621–1629 гг. Рэканструкцыя зроблена на аснове збору лістоў, якія захаваліся ў шэрагу архіваў Беларусі, Украіны, Польшчы і Літвы. Лісты дазволілі акрэсліць маршрут, праграму навучання, стан здароўя і розныя здарэнні. Акрамя таго, у іх утрымліваецца інфармацыя пра стан дарог, транспарт, уплыў палітычных і ваенных падзей на падарожжа.

*У другім раздзеле,* на аснове дыярыуша Караля Станіслава Радзівіла, зроблена рэканструкцыя адукацыйнага падарожжа Караля Станіслава і Юрыя Юзафа Радзівілаў, якое адбылося ў 1684–1687 гг. Дзякуючы рэгулярным запісам у дыярыушы атрымалася дастаткова падрабязна аднавіць маршрут падарожжа, аднак дыярыуш не дазволіў так глыбока, як лісты, аднавіць змест адукацыйнага падарожжа.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Паступовыя, перарывістыя, нелінейныя змены, якія прыводзяць, сярод іншага, да рэформы сістэмы адукацыі, адрыву яе ад касцёла, пачынаюцца пасля наступлення эпохі Рэнесансу і замацоўваюцца падчас Рэфармацыі і Контррэфармацыі. У ВКЛ змены адбываліся ў XVI ст., ішло інтэнсіўнае развіццё дзяржаўнай і прававой сістэмы, эканамічныя, сацыяльныя і культурныя рэформы. Гэта прывяло да змены роляў эліты дзяржавы і ўцягвання магнатаў у парытэтнае з манаршай дынастыяй дзяржаўнае кіраванне, што патрабавала ад

іх новых кампетэнцый і ведаў. У гэты час пачалі адкрывацца навучальныя ўстановы новага тыпу ў Свяшчэннай Рымскай імперыі, якія прапаноўвалі новыя ўзоры навучальных праграм, прывабныя для магнатаў. Гэта і стала перадумовай узнікнення традыцыі замежных адукацыйных падарожжаў. Нягледзячы на кардынальную рэформу адукацыі ў Еўропе, адукацыйныя падарожжы па-ранейшаму праходзілі ў сярэдневяковай форме перэгрынацый (peregrinatio academica), калі ўвага была засяроджана толькі на мэце падарожжа – пэўным універсітэце ці наборы навук. У арыстакратаў да гэтага спісу маглі дадавацца мэты прэзентацыі свайго роду, усталяванне і падтрымка кантактаў з еўрапейскімі элітамі, манаршымі дынастыямі, заўважнымі дзеячамі рэлігіі і культуры [1; 2; 11; 15; 22].

2. К сярэдзіне XVII ст. адбыліся змены ў поглядах на адукацыйныя падарожжы, працэс падарожжа пачалі разглядаць як магчымасць пашырыць кругагляд, прывіць добры густ, азнаёміцца з дасягненнямі культуры і асаблівасцямі дзяржаўнага кіравання. Паступова змены аформіліся ў новую форму адукацыйных падарожжаў, якая атрымала назву гранд тур (Grand Tour). Новая канцэпцыя падарожжаў пашырала погляд на падрыхтоўку да будучай дзяржаўнай дзейнасці маладых магнатаў. Акрамя грунтоўных ведаў і замежных моў, карысным пачалі лічыць вопыт знаходжання ў элітарным асяроддзі іншай дзяржавы, пашырэнне кругагляду, развіццё мастацкага густу. Такі падыход змяняў арганізацыю падарожжа, яго маршруты, павялічыўся кошт падарожжа.

Паступова рос узровень адукацыі ў ВКЛ, мяняліся ідэалы выхавання, і турыстычны аспект у адукацыйных падарожжах рабіўся ўсё большым, а акадэмічны змяншаўся. К XVIII ст. цэнтрамі адукацыі сталі спецыяльныя рыцарскія школы, якія прапаноўвалі больш кароткія, насычаныя і практычныя курсы. У 40-х гг. XVIII ст. такія школы пачалі адкрывацца ў Рэчы Паспалітай, і на гэтым фоне адбыўся спад цікавасці да замежных падарожжаў. У другой палове XVIII ст. у Еўропу з мэтай адукацыі ехалі адзінкі. Звязана гэта было не толькі са здавальняючым узроўнем адукацыі ўнутры ВКЛ, але і са складанай палітычнай сітуацыяй, падзеламі Рэчы Паспалітай, якія канчаткова перарвалі традыцыю адукацыйных падарожжаў магнатаў ВКЛ ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы [1; 4; 5; 7; 8; 10; 11; 15; 18; 23].

3. Адукацыйныя падарожжы магнатаў ВКЛ значна адрозніваліся ад адукацыйных падарожжаў менш заможных людзей. Адрозненні былі ў большай працягласці падарожжа, больш складанай арганізацыі і вялікай колькасці суправаджаючых, з якіх складаўся «перасоўны двор» магната. Традыцыя світы вырашала некалькі пытанняў: утварала камфортныя ўмовы падчас падарожжа, дазваляла атрымаць еўрапейскую адукацыю маладым шляхціцам, у якіх магло

не быць іншай магчымасці, фарміравала будучае адукаванае асяроддзе магната. Адрозненне адукацыйных падарожжаў магнатаў было і ў фігуры гувернёра. Магнаты маглі дазволіць сабе браць у падарожжа некалькі гувернёраў і наймаць лепшых прафесіяналаў, якія ўжо былі ў Еўропе да гэтага і ведалі асаблівасці розных еўрапейскіх навуковых асяроддзяў.

Калі мэтай асноўнай часткі студэнтаў у ранні Новы час было атрыманне прафесіі і статусу, які надаваў дыплом, то магнаты ў дыпломе зацікаўлены не былі. Падчас падарожжа яны вучыліся па індывідуальных праграмах, наведвалі толькі асобныя лекцыі. Шмат увагі надавалі мовам, вучылі нямецкую, італьянскую, французскую, іспанскую, турэцкую, венгерскую і інш. Наведвалі лекцыі па гісторыі, філасофіі, геаграфіі, праву, рыторыцы, матэматыцы, астраноміі. Абавязкова падчас падарожжа надавалі ўвагу фехтаванню і верхавой яздзе, наведвалі еўрапейскія рыцарскія школы. У XVII ст. сярод магнатаў пачынае расці папулярнасць візітаў у ваенныя лагеры, каб пазнаёміцца з арганізацыяй замежнай арміі, убачыць вайсковыя ўмацаванні. Да XVIII ст. вайсковая адукацыя ў некаторых выпадках робіцца адной з галоўных мэт адукацыйнага падарожжа [3; 7; 8; 9; 11; 12; 15; 18; 23].

4. Істотнай асаблівасцю адукацыйных падарожжаў магнатаў з'яўляецца іх шырокая геаграфія. Магнаты падчас падарожжа наведвалі не адзін універсітэт і паспявалі аб'ехаць некалькі дзяржаў. Асноўны маршрут праходзіў праз нямецкія землі, адтуль ехалі ў Францыю, далей – у Італію. Паміж гэтымі дзяржавамі наведвалі Нідэрланды і Швейцарыю. Акрамя таго, у маршрут маглі ўключыць Вялікабрытанію і Іспанію. Найбольш папулярнымі ўніверсітэцкімі цэнтрамі для магнатаў былі: Альтдорф, Гейдэльберг, Інгальштат, Кёнігзберг, Лейпцыг, Страсбург, Базель, Лёвен, Лейдэн, Парыж, Арлеан, Балоння, Падуя, Рым і інш.

Выбар універсітэта і канструяванне маршрута залежалі не толькі ад узроўню прафесараў, зручнага геаграфічнага становішча і традыцый роду, але і ад канфесійнай і палітычнай прыналежнасці магната. Прыналежнасць да пэўнай канфесіі ўплывала на асаблівасці пераймання традыцыі адукацыйных падарожжаў з моманту іх распаўсюджання сярод магнатаў ВКЛ у XVI ст. Першымі да адукацыі ў еўрапейскіх універсітэтах сістэмна прыйшлі пратэстанцкія сем'і, якія цікавіліся ідэямі Рэфармацыі. Пасля традыцыю падхапілі каталіцкія сем'і, якія і раней адпраўляліся адзінкава ў еўрапейскія ўніверсітэты. Аднак распаўсюджанай традыцыя еўрапейскай адукацыі стала толькі ў часы Контррэфармацыі. Пры гэтым працэс канфесіяналізацыі, які разгортваўся ў Еўропе ў XVI–XVIII стст., далучаў да гэтага і палітычны аспект, што ўплывала на маршрут.

Католікі ехалі да паўднёвых нямецкіх зямель, Лёвена і каталіцкіх школ і ўніверсітэтаў Італіі. «Пратэстанцкі» шлях ішоў па поўначы Свяшчэннай Рымскай імперыі, Швейцарыі і Галандыі. У Аб’яднаных правінцыях сустракаліся і перасякаліся гэтыя дзве плыні, і выбар ваенных лагераў, школ і ўніверсітэтаў рабіўся палітычным (падчас Трыццацігадовай вайны магнаты выбіралі ўніверсітэты і ваенныя лагеры галандцаў ці іспанцаў). Найбольшыя цяжкасці былі ў праваслаўных сем’яў, бо яны даўжэй трымаліся старой традыцыі разумення эліты як вайсковага саслоўя, чаму спрыялі частыя ваенныя паходы на поўдні і ўсходзе ВКЛ. Галоўнае ж – тое, што ў Еўропе адсутнічалі спецыялізаваныя праваслаўныя навучальныя ўстановы. Аднак пытанне прэстыжу і неабходнасці набыцця сучасных актуальных ведаў вымагала і іх далучацца да традыцыі еўрапейскіх адукацыйных падарожжаў [2; 8; 11; 14; 15; 20; 21].

5. Характэрнай рысай і асаблівасцю адукацыйных падарожжаў магнатаў было актыўнае вядзенне апякунскай карэспандэнцыі і дыярыуша. Лісты былі адным з нешматлікіх сродкаў камунікацыі падчас падарожжа, якія дазвалялі кантраляваць і карэктаваць працэс адукацыі. Лісты змяшчаюць інфармацыю, якая максімальна поўна раскрывае змест і ход адукацыйнага падарожжа, дазваляе прасачыць сувязь з мецэнатам і зваротную яго рэакцыю на пэўныя падзеі падчас падарожжа. Так, маршруты адукацыйных падарожжаў сыноў Льва Сапегі атрымалася аднавіць з пэўнымі абагульненнямі. Аднак змест падарожжа праз лісты адлюстраваны вельмі глыбока: праграма навучання, стан здароўя, розныя здарэнні, адносіны паміж членамі світы, уплыў палітычных і ваенных падзей на падарожжа і шмат іншай інфармацыі магчыма вылучыць з гэтых крыніц.

Іншай крыніцай, якая характэрна для адукацыйных падарожжаў магнатаў, з’яўляюцца дыярыушы, яны змяшчаюць інфармацыю пра ўяўленні, рэакцыі і прыярытэты аўтара, што дазваляе рэканструяваць падарожжа знутры. На прыкладзе дыярыуша Караля Станіслава Радзівіла, які разам з братам Юрыем Юзафам адбыў сваё падарожжа ў другой палове XVII ст., бачна, што дыярыуш дае добрую інфармацыю для аднаўлення падрабязнага маршруту, аднак значна горш, у параўнанні з карэспандэнцыяй, раскрывае змест падарожжа. Так, Караль Станіслаў Радзівіл у сваім дыярыушы апісаў асноўныя архітэктурныя славутасці і шматслоўна ахарактарызаваў розныя скульптурныя кампазіцыі ў Парыжы, Рыме і іншых еўрапейскіх гарадах. Аднак інфармацыю пра тое, якія ўніверсітэты наведвалі, што вывучалі, і з кім сустракаліся Радзівілы, магчыма атрымаць толькі з іншых крыніц (лісты, канспекты лекцый, дыярыушы іншых магнатаў) [4; 5; 6; 13; 16; 17; 19; 20; 22].

**Рэкамендацыі да практычнага выкарыстання вынікаў даследавання**

Аналіз традыцыі адукацыйных падарожжаў магнатаў ВКЛ у еўрапейскія ўніверсітэты ў XVI–XVIII стст. можа быць выкарыстаны для далейшай распрацоўкі пытанняў, звязаных з гісторыяй адукацыі і падарожжаў з тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст., у дыдакцыйнай дзейнасці – пры падрыхтоўцы спецыяльных і абагульняючых прац (у галіне гісторыі Беларусі, культуры і адукацыі на беларускіх землях, пры вывучэнні гісторыі падарожжаў і турызму, тэорыі эліты Цэнтральнай і Усходняй Еўропы), вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Вынікі даследавання ляглі ў аснову вучэбнага дапаможніка «Гісторыя падарожжаў і турызму» для навучэнцаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі (2022 г.), дзе асобны раздзел прысвечаны гісторыі падарожжаў магнатаў і шляхты ВКЛ [24].

Напрацаваны аўтарам матэрыял выкарыстоўваецца кафедрай сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у турызме і гасціннасці Інстытута менеджменту спорту і турызму установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры» (акт аб укараненні вынікаў навукова-даследчай працы ў адукацыйны працэс ад 16.11.2022, дадатак Э).

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць укаранёны ў навучальны працэс дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» (даведка ад 20.10.2023, дадатак Ю).

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

*Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках навуковых прац, уключаных Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў:*

1. Калтачэнка, А. І. Метадалагічныя аспекты вывучэння адукацыйных падарожжаў XVI–XVIII стст. на прыкладзе адукацыі Якуба Сабескага / А. І. Калтачэнка // Вестник БарГУ. Сер. Исторические науки и археология. Экономические науки. Юридические науки. – 2020. – Вып. 8. – С. 27–31.

2. Калтачэнка, А. І. Геаграфія замежных адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI–XVIII стст. / А. І. Калтачэнка // Вышэйшая школа. – 2021. – № 2. – С. 45–49.

3. Калтачэнка, А. І. Праграмма навучання падчас адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў ранні Новы час / А. І. Калтачэнка // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки. – 2021. – Вып. 21. Ч. 1. – С. 166–173.

4. Калтачэнка, А. І. Адукацыйнае падарожжа Юрыя Юзафа і Караля Станіслава Радзівілаў у 1684–1687 гг. / А. І. Калтачэнка // Вышэйшая школа. – 2023. – № 4. – С. 57–60.

5. Калтачэнка, А. І. Адукацыйныя падарожжы Льва Сапегі і яго сыноў ва ўніверсітэты Германіі, Нідэрландаў і Італіі ў 1570–1630 гг. / А. І. Калтачэнка // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2023. – № 3. – С. 5–14.

6. Калтачэнка, А. І. Лісты Крыштофа Мікалая і Казіміра Леона Сапегаў з падарожжа па Еўропе ў 1621-1629 гг. / А.І. Калтачэнка // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт., вып. 21, Мінск, 2023 г. / рэдкал. : В.Ф. Голубеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : НГАБ, 2023. – С. 52–65.

*Артыкулы ў зборніках навуковых прац:*

7. Калтачэнка, А. І. Мэты падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVII–XVIII стст. / А. І. Калтачэнка // Сб. науч. ст. студентов, магистрантов, аспирантов / Белорус. гос. ун-т, Факультет междунар. отношений; под общ. ред. д-ра. ист. наук В. Г. Шадурского. – Вып. 22. – Минск, 2019. – С. 29–31.

8. Калтачэнка, А. І. Роля еўрапейскай адукацыі ў кар’еры магнатаў Вялікага Княства Літоўскага XVII ст. / А. І. Калтачэнка // Сб. науч. ст. студентов, магистрантов, аспирантов / Белорус. гос. ун-т, Факультет междунар. отношений;

под общ. ред. д-ра. ист. наук В. Г. Шадурского. – Вып. 24. – Минск, 2020. – С. 38–40.

9. Калтачэнка, А. І. Хто ў XVI–XVIII стст. суправаджаў маладых магнатаў падчас адукацыйных падарожжаў / А. І. Калтачэнка // Сб. науч. ст. студентов, магистрантов, аспирантов / Белорус. гос. ун-т, Факультет междунар. отношений; под общ. ред. д-ра. ист. наук В. Г. Шадурского. – Вып. 25. – Минск, 2021. – С. 45–47.

10. Калтачэнка, А. І. Месца Гранд тура ў мадэлі адукацыі магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVII–XVIII стст. / А. І. Калтачэнка // Сб. науч. ст. студентов, магистрантов, аспирантов / Белорус. гос. ун-т, Факультет междунар. отношений; под общ. ред. д-ра. ист. наук В. Г. Шадурского. – Вып. 26. – Минск, 2021. – С. 44–45.

11. Kaltachenka, A. Traditions of European educational travel from the Grand Duchy of Lituaniae to Europe on the example of the Pac family in the XVI–XVIII centuries / A. Kaltachenka // Kauno Istorijos Metraštis. – 2022. – T.20. – S. 57–70.

12. Калтачэнка, А .І. Павучанні і інструкцыі Ганны з Сангушкаў Радзівіл да свайго сына Геранiма Фларыяна Радзівіла падчас яго выезда за межы Вялікага Княства Літоўскага / А. І. Калтачэнка // Herstoria: autorki i bohaterki tekstów kultury. – Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego, 2022. – С. 49–61.

13. Калтачэнка, А. І. Дзённікі падарожжа як частка мемуарнай спадчыны роду Радзівілаў // Сб. науч. ст. студентов, магистрантов, аспирантов / Белорус. гос. ун-т, Факультет междунар. отношений; под общ. ред. д-ра. ист. наук В. Г. Шадурского. – Вып. 29. – Минск, 2023. – С. 18–20.

14. Kaltachenka, A. Differences between women’s and men’s travels from the territory of the Grand Duchy of Lithuania in the Early Modern Period to Italy / A. Kaltachenka // Eastern European History Review. – 2023. – № 6. – S. 33–46.

*Артыкулы ў зборніках матэрыялаў канферэнцый:*

15. Калтачэнка, А. І. Асаблівасці еўрапейскай адукацыі магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII ст. / А. І. Калтачэнка // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. артык. Міжнар. навук. канф., прысвеч. 80-год. Гродзен. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы і 65-год. гіст. адукацыі ў Гродзен. дзярж. ун-це імя Янкі Купалы, Гродна, 12-13 снеж. 2019 г.: у 2 ч. / ГрДУ імя Я. Купалы ; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.), І. Ф. Кітурка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2019. – Ч. 2. – С. 227–229.

16. Калтачэнка, А. І. Лёс Саламеі Пільштыновай: вандроўніцы і лекаркі XVIII ст. / А. І. Калтачэнка // Женщины-ученые Беларуси и Польши : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 26 марта 2020 г. / БГУ ; редкол.: И. В. Казакова, И. В. Олюнина (отв. ред.). – Минск, 2020. – С. 306–310.

17. Калтачэнка А. І. Магчымасці інтэрнэт-рэсурсаў у працы з фамільнымі архівамі магнацкіх родаў Беларусі / А. І. Калтачэнка // Лёс фамільных скарбаў магнацкіх родаў Беларусі : матэрыялы Міждунар. навук. канф., Нясвіж, 10 лістап. 2020 г. / Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» ; уклад.: У. У. Караленак, С. М. Клімаў. – Нясвіж, 2020. – С. 161–180.

18. Калтачэнка, А. І. Мадэль адукацыі магнатаў Вялікага Княства Літоўскага XVI – першай паловы XVIII ст. / А. І. Калтачэнка // Социально-гуманитарные знания : материалы XVII Респ. науч. конф. молодых ученых и аспирантов, Минск, 26 нояб. 2020 г. / РИВШ ; редкол.: И. В. Титович (пред.) [и др.]. – Минск, 2020. – С. 63–66.

19. Калтачэнка, А. І. Крыніцы вывучэння замежнай адукацыі магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў ранні Новы час / А. І. Калтачэнка // Пічэтаўскія чытанні – 2021: 100 гадоў БДУ – першаму ўніверсітэту Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэтыч. канф., Мінск, 27–28 кастр. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун- т; рэдкал. : А. Д. Кароль (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск, 2021. – С. 309–316.

20. Калтачэнка, А. І. Адукацыйнае падарожжа Крыштафа Мікалая Сапегі і Казіміра Леона Сапегі ў лістах да сям'і / А. І. Калтачэнка // Пічэтаўскія чытанні – 2022: універсітэты і архівы як састаўныя элементы экалогіі культуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 30 верас. 2022 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск, 2022. – С. 88–94.

21. Калтачэнка, А. І. Маршруты адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага XVI – першай паловы XVIII ст. / А. І. Калтачэнка // Социально-гуманитарные знания : материалы XIX Респ. науч. конф. молодых ученых и аспирантов, Минск, 30 нояб. 2022 г. / РИВШ ; редкол.: И. В. Титович (пред.) [и др.]. – Минск, 2022. – С. 52–55.

22. Калтачэнка, А. І. Дыярыуш падарожжа і яго эвалюцыя ў XVI–XVIII ст. / А. І. Калтачэнка // матэрыялы XIX Міжнар. кнігазнаўчых чытанняў, Мінск, 26–27 крас. 2023 г. / Нац. б-ка Беларусі ; склад.: Т. У. Карнілава, Г. У. Кірэева ; рэдкал.: А. Ю. Кніжнікава (старш.) [і інш.]. – Минск, 2023. – С. 26–30.

23. Калтачэнка, А. І. Крытыка замежнай адукацыі магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI – першай палове XVIII ст. / А. І. Калтачэнка // Україна і Велике князівство Литовське в XIV–XVIII ст.: політичні, економічні, міжнаціональні та соціокультурні відносини в загальноєвропейському вимірі: Програма та тези доповідей VII Міжнар. наук. конф., Кам'янець-Подільський, 20–23 жовтня 2021 р. / Ін-т історії України НАН України, 2021. – С. 49–51.

*Вучэбныя выданні:*

24. Колтаченко, А. И. Путешествия представителей знатных родов ВКЛ / А. И. Колтаченко // История путешествий и туризма : учеб. пособие. – Минск: РИПО, 2022. – С. 25–48.

# РЭЗЮМЭ

**Калтачэнка Аліна Ігараўна**

**Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.**

**Ключавыя словы:** адукацыйныя падарожжы, магнаты Вялікага Княства Літоўскага, прадстаўнікі магнацкія сем’яў, еўрапейскія ўніверсітэты, peregrinatio academica, гранд тур, ранні Новы час, Сапегі, Радзівілы

**Мэта даследавання:** выяўленне сутнасці і зместу падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы як спецыфічнай адукацыйнай з’явы ў XVI–XVIII стст.

**Метады даследавання:** агульнанавуковыя метады (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя) і спецыяльныя метады гістарычнага пазнання: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны, метад гістарычнай рэканструкцыі і метад прасапаграфіі, case studies.

**Навуковая навізна даследавання:** сабраны, прааналізаваны і сістэматызаваны матэрыялы, якія раскрываюць з’яву адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.; даследаваны прычыны ўзнікнення традыцыі адукацыйных падарожжаў, іх развіццё і змены формы падарожжаў; асаблівасці магнацкіх адукацыйных падарожжаў у арганізацыі, праграме навучання і геаграфіі; залежнасць адукацыйнага падарожжа ад канфесійнай прыналежнасці магната; праведзена рэканструкцыя адукацыйных падарожжаў па Еўропе прадстаўнікоў Сапегаў і Радзівілаў.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны для далейшай распрацоўкі пытанняў, звязаных з гісторыяй адукацыі і падарожжаў з тэрыторыі Беларусі у XVI–XVIII стст., у дыдакцыйнай дзейнасці – пры падрыхтоўцы спецыяльных і абагульняючых прац (у галіне гісторыі Беларусі, культуры і адукацыі на беларускіх землях, пры вывучэнні гісторыі падарожжаў і турызму, тэорыі эліты Цэнтральнай і Усходняй Еўропы), вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных установаў адукацыі.

**Галіна выкарыстання:** гісторыя Беларусі, гісторыя адукацыі, гісторыя падарожжаў, сфера вышэйшай і агульнай сярэдняй адукацыі.

## РЕЗЮМЕ
## Колтаченко Алина Игоревна

## Образовательные путешествия магнатов Великого Княжества Литовского в университеты Западной Европы в XVI–XVIII вв.

**Ключевые слова:** образовательные путешествия, магнаты Великого Княжества Литовского, представители магнатских семей, европейские университеты, peregrinatio academica, гранд тур, раннее Новое время, Сапеги, Радзивиллы

**Цель исследования:** выявление сущности и содержания путешествий магнатов Великого Княжества Литовского в университеты Западной Европы как специфического образовательного явления в XVI–XVIII вв.

**Методы исследования:** общенаучные методы (анализ, синтез, индукция, дедукция) и специальные методы исторического познания: историко-генетический, историко-сравнительный, историко-системный, метод исторической реконструкции и метод просопографии, case studies.

**Научная новизна исследования:** собраны, проанализированы и систематизированы материалы, раскрывающие явление образовательных путешествий представителей магнатских семей Великого Княжества Литовского в университеты Западной Европы в XVI–XVIII вв.; исследованы причины возникновения традиции образовательных путешествий, их развитие и изменение формы путешествий; особенности магнатских образовательных путешествий в организации, программе обучения и географии; зависимость образовательного путешествия от конфессиональной принадлежности магната; проведена реконструкция образовательных путешествий по Европе представителей Сапег и Радзивиллов.

**Рекомендации к использованию:** результаты диссертационного исследования могут быть использованы для дальнейшей разработки вопросов, связанных с историей образования и путешествий с территории Беларуси в XVI–XVIII вв., в дидактической деятельности – при подготовке специальных и обобщающих работ (в области истории Беларуси, культуры и образования на белорусских землях, при изучении истории путешествий и туризма, теории элиты Центральной и Восточной Европы), учебных пособий по истории Беларуси для высших и средних специальных учреждений образования.

**Область использования:** история Беларуси, история образования, история путешествий, сфера высшего и общего среднего образования.

## SUMMARY

**Kaltachenka Alina**

### Educational Journeys of the magnates of the Grand Duchy of Lithuania to Western European Universities in the 16th–18th centuries

**Key words:** educational journeys, magnates of the Grand Duchy of Lithuania, representatives of magnate families, European universities, peregrinatio academica, Grand Tour, Early Modern times, Sapieha, Radziwill

**Purpose of the research:** to reveal the nature and content of the journeys undertaken by the magnates of the Grand Duchy of Lithuania to the universities of Western Europe as a specific educational phenomenon during the 16th–18th centuries.

**Research methods:** general scientific methods (analysis, synthesis, induction, deduction) and special methods of historical cognition: historical-genetic, historical-comparative, historical-systemic, method of historical reconstruction and prosopography, case studies.

**Scientific novelty of the research:** the study has collected, analyzed, and systematized the materials that reveal the phenomenon of educational journeys by representatives of magnate families from the Grand Duchy of Lithuania to Western European universities during the 16th–18th centuries; it has examined the reasons for the emergence of this educational travel tradition; its development and transformation; the features of magnate educational journeys in terms of organization, educational programs, and geography; the dependency of educational journeys on the confessional affiliation of the magnate; and has reconstructed the educational journeys across Europe undertaken by members of the Sapieha and Radziwill families.

**Recommendations for use:** the results of this dissertation research can be applied for the further exploration of issues related to the history of education and travel from the territory of Belarus in the 16th–18th centuries. They are applicable in didactic activities for preparing specialized and generalized works in the fields of Belarusian history, culture, and education on Belarusian lands, as well as in the the study of the history of travel and tourism, and the theory of the elite of Central and Eastern Europe. The findings may also inform about the educational materials on Belarusian history for higher and specialized secondary educational institutions.

**Field of application:** history of Belarus, history of education, history of travelling, sphere of higher and general secondary education.